*Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!*
*ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ*



# НАША СЛОВА

Газета выходзіць з сакавіка 1990 года    № 47 (938)    25 ЛІСТАПАДА 2009 г.

# Ад Ліды да Вільні - 90 км

Пасля ўстаноўкі ў Менску знака “Нулявога кіламетра” аналагічныя знакі пачалі ўстанаўліваць у розных гарадах Беларусі. Летась такі знак быў устаноўлены і ў Лідзе непадалёк ад Галоўпаштамту. Знак быў выкананы на рускай мове. Цягам году знак цярпеў ад мясцовых вандалаў, якім ён чамусьці муляў вока. Было вырашана знак перарабіць. На гэты раз аўтарам праекту і выканаўцам быў вядомы лідскі скульптар, мастак, паэт Рычард Груша. У адрозненне ад папярэдняга новы знак выкананы з ужываннем толькі беларускай мовы. Усе надпісы выкананы па-беларуску. Назва кожнага горада была выверана па слоўніках. Таму арфаграфічных памылак, у адрозненне ад доследу апошняга часу ў іншых гарадах, тут няма. Асаблівасцю лідскага знака з’яўляецца і тое, што назва нашай старажытнай сталіцы пададзена ў беларускім вымаўленні - **Вільня**. Гэта, безумоўна, правільна і лагічна. Менавіта **Вільню** мы бачым ва ўсіх летапісах, хроніках, метрыках. У Лідзе каторы год ідзе змаганне за вяртанне спрадвечнай назвы **Віленская** цэнтральнай вуліцы горада. Сёлета зноў ішоў масавы збор подпісаў, праўда, пакуль безвыніковы. Хаця вуліцы **Віленскія** ў Беларусі ёсць. Прынамсі ёсць такая вуліца ў Маладзечне, ёсць такая вуліца ў мястэчку Беліца Лідскага раёна. А вось на дарожных знаках Беларусі паўсюль пішуць **Вільнюс**. Ну не пішам жа мы **Бялы сток**, а пішам **Беласток**, не пішам **Львів**, а пішам **Львоў**. Літоўцы пішуць на аўтобусах **Мінскас** і **Пінскас.** Ну, і няхай пішуць на здароўе, калі яны так называюць нашыя гарады, а мы Вільню заўсёды называлі **Вільняй**, то і на дарожных знаках, на аўтобусах, на аўтобусных і чыгуначных білетах, на іншых указальніках і ў іншых паперах мы павінны пісаць **Вільня**. Гэта нашае права, якое ніхто не можа аспрэчыць.






*Яраслаў Грынкевіч.*

ISSN 2073-7033

## Паважаныя сябры!

**Канферэнцыя Менскай абласной арганізацыі ТБМ адбудзецца 29 лістапада 2009 г. у сядзібе па вул. Румянцава, 13.**
**Абмяркуем планы і вынікі нашай працы.**
**Запрашаюцца сябры Рады, рэвізійнай камісіі, дэлегаты арганізацый і суполак.**
**Пачатак а 13 гадзіне.**

# 150 гадоў з дня нараджэння Мікалая Янчука

**ЯНЧУК** Мікалай Андрэевіч (29.11.-1859, в. Карніца Люблінскага ваяводства, Польшча — 6.12.1921), бел. вучоны-славіст, пісьменнік. Скончыў Маскоўскі ун-т (1885). Працаваў настаўнікам, з 1892 пам. бібліятэкара Румянцаўскага музея, хавальнік Дашкаўскага этнагр. музея ў Маскве. У 1889—1903 сакратар аддз. этнаграфіі Т-ва аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі пры Маскоўскім ун-це, з 1901 стваральнік і кіраўнік Музычна-этнаграфічнай камісіі пры ім. Адзін з заснавальнікаў час. «Эгнографнческое обозрение», дзе друкавалася шмат бел. матэрыялаў. Пасля 1917 чытаў курс бел. і ўкр. л-р у Маскоўскім ун-це, удзельнічаў у рабоце камісіі па арганізацыі Бел. ун-та, у 1921 праф. кафедры бел. л-ры і этнаграфіі БДУ. У 1918—21 чл. Беларускага навукова-культурнага таварыства ў Маскве, супрацоўнічаў з Беларускім нацыянальным камісарыятам і Беларускім пададдзелам аддзела асветы нацыянальных меншасцей Народнага камісарыята асветы РСФСР. Вывучаў побыт і нар. творчасць усх. славян. Даследаваў бел., літ., польскі, рус, укр. муз. фальклор. Матэрыялы экспедыцыі ў Менскую губ. (у 1886) друкаваў у газ. «Минский вестник» (1886—87) і навук. выданнях. Склаў «Праграму для збірання этнаграфічных звестак» (1887, з М. Харузіным). Збіраў, даследаваў і апрацоўваў бел. муз. фальклор.



Аўтар муз.- фальклярыстычных прац «Маларускае вяселле ў Карніцкай парафіі Канстанцінаўскага павета Сядлецкай губерні» (1886), «Па Менскай губерні» (1889), працы па антрапалогіі «Некаторыя дадзеныя да пытання аб антрапалагічным тыпе беларусаў» (1890), апрацовак нар. песень, рэдактар муз.-фалькл. зб-каў...

# 110 гадоў з дня нараджэння Міхася Лынькова



**ЛЫНЬКОЎ** Міхась [Міхаіл Ціханавіч; 18(30). 11.1899, в. Зазыбы Віцебскага р-на — 21.9.1975], беларускі сав. празаік, крытык, літаратуразнавец, грамадскі дзеяч. Нар. пісьменнік БССР (1962). Акад. АН БССР (1953, чл.-кар. 1936). Скончыў Рагачоўскую настаўніцкую семінарыю (1917). Удзельнічаў у партыз. руху ў Грамадз. вайну. У 1919—22 у Чырв. Арміі. Настаўнічаў у Буда-Кашалёўскім і Рагачоўскім р-нах (1917—19 і 1922—25). Працаваў адказным сакратаром, рэдактарам бабруйскай акруговай газ. «Камуніст» (1925—30). У 1930— 32 у Дзярж. выд-ве БССР. У 1933—41 гал. рэдактар час. «Полымя рэвалюцыі». Быў арганізатарам і кіраўніком Бабруйскай філіі «Маладняка», адным з кіраўнікоў БелАПП. Удзельнік вызвалення Зах. Беларусі (1939) і Айч. вайны. Рэдактар газ. «Беларуская звязда» (1939), «За Савецкую Беларусь» (1941— 42). Старшыня СП БССР (1938—48), дырэктар Ін-та л-ры, мовы і мастацтва АН БССР (1943— 46 і 1949—52). Друкаваўся з 1919. У напоўненых гуманіст. пафасам апавяданнях 20—30-х г. (зборнікі «Апавяданні», 1927, «Гой», 1929, «Андрэй Лятун», 1930, «Саўка-агіцірнік», 1933, і інш.) пераважна на аснове асабістага жыццёвага досведу пісаў пра героіку рэвалюцыі і Грамадз. вайны («Над Бугам», «Крот», «Манчжур», і інш.), як змяняліся міжнацыя-нальныя адносіны («Гой»), усталёўваўся новы побыт («У мястэчку»). Шмат увагі аддаваў паказу гарадскога і местачковага жыцця, рабочага асяроддзя («Гома», «Чыгунныя песні», «Журавель мой, журавель» і інш.). У аповесцях для дзяцеп «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў» (1935) і «Міколка-паравоз» (выд. 1936), што сталі класічнымі творамі бел. дзіцячай л-ры, рамантызуецца героіка рэв. змагання, створана дынамічная і займальная падзейная плынь, у якой яркая і маляўнічая апавядальнасць атрымала арыгіна-льную лірыка-гумарыст. падсветку. Выдатныя падзеі і самыя яркія эпізоды партыз. вайны на Беларусі супраць ням.-фаш. акупантаў, у т. л. гераічная дзейнасць К. С. Заслонава, атрымалі эмацыянальна-ўсхваляванае ўвасабленне ў рамане «Векапомныя дні» (у 4 кн., 1-е поўнае выд. 1958; Дзярж. прэмія БССР імя Я. Коласа 1968)...